УДК 619:618.19-002:615.33:636.221.28(476.6)

# ПОШУКІ ЎЗБУДЖАЛЬНІКА МАСТЫТАЎ НА МТК “ТАКАРЫШКІ” ІЎЕЎСКАГА РАЁНА І ЯГО АДЧУВАЛЬНАСЦЬ ДА ТЭРАПЕЎТЫЧНЫХ ПРЭПАРАТАЎ

**Таранда М. І., Дзянісевіч М. І.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Важным і неабходным пры з’яўленні на МТК ці ферме захворванняў жывёлы на мастыт з’яўляецца вызначэнне вінаватага ў гэтым мікроба. Для таго, каб яго выдзеліць, неабходна выкарыстаць розныя пажыўныя асяроддзі, на якіх бы раслі бактэрыі аманіфікатары, стафілакокі, гемалітычныя стрэптакокі, энтэрабактэрыі. Паколькі на МТК “Такарышкі” УСП “Новы Двор-Агра” Іўеўскага раёна з’явіліся каровы з субклінічным мастытам, на кафедру мікрабіялогіі было дастаўлена малако ад жывёлы, якая не лячылася. Колькасць узораў малака – 23. Разам з малаком былі атрыманы і лекавыя прэпараты, якімі карыстаюцца ў гаспадарцы. Таму была магчымасць выдзеліць узбуджальніка мастыту і праверыць яго на адчувальнасць як да чыстых антыбіётыкаў, так і да гатовых прэпаратаў у шпрыцах.

Першым крокам было прыгатаванне развядзення 1:100 узораў малака № 1, 3, 5, 7, 9 і 11 для газоннага высеву на МПА, на якім расклалі дыскі з антыбіётыкамі (табліца 1).

Табліца 1 – Адчувальнасць да антыбіётыкаў мікраарганізмаў малака, хворых на субклінічны мастыт кароў, мм (пазначаны № узораў і кароў)

| Антыбіётыкі / № | 1-337 | 3-99 | 5-274 | 7-521 | 9-710 | 11-38 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Амікацын | 30 | 30 | 22 | 0 | 0 | 26 |
| Ломафлаксацын | 32 | 36 | 32 | 30 | 22 | 38 |
| Цэфалексін | 0 | - | 28 | 0 | 0 | 30 |
| Норфлаксацын | 44 | 30 | 0 | 25 | 0 | 26 |
| Цыпрафлаксацын | 34 | 36 | 34 | 32 | 24 | 40 |
| Лінкаміцын | 0 | 14 | 0 | 0 | 0 | 20 |
| Бензілпеніцылін | 0 | 10 | 10 | 0 | 0 | 10 |
| Амоксіцылін | 0 | 10 | 0 | 0 | 0 | 10 |
| Оксацылін | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| Рыфампіцын | 14 | 0 | 20 | 0 | 0 | 10 |
| Поліміксін | 22 | 10 | 20 | 28 | 28 | 26 |
| Новабіяцын | 0 | 12 | 12 | 0 | 0 | 0 |
| Гентаміцын | 12 | 20 | 16 | 12 | 15 | 34 |
| Стрэптаміцын | 0 | 30 | 22 | 10 | 8 | 12 |
| Цэфтазідзім | 36 | 24 | 12 | 30 | 0 | 0 |
| Цэфенім | 18 | 20 | 20 | 26 | 12 | 24 |

Як бачна з табліцы 1, на большую частку мікраарганізмаў моцнае дзеянне аказваюць ломафлаксацын, цыпрафлаксацын, поліміксін, цэфенім. Высокую адчувальнасць, але не ўсе мікраарганізмы, маюць да амікацыну, норфлаксацыну, цефтазідзіму. Мікробы малака кароў з субклінічным мастытам устойлівыя да лінкаміцыну, бензілпеніцыліну, амоксіцыліну, оксацыліну, рыфампіцыну, новабіяцыну.

Былі таксама адабраныя формы энтэрабактэрый, якія высяваліся бактэрыяльнай пятлёй на пажыўнае асяроддзе Энда з малака ўсіх 23 кароў (на МПА выраслі ў такой жа колькасці тыя ж формы бактэрый).

Прэпаратамі са шпрыцоў, атрыманымі з гаспадаркі, былі прапітаныя стэрыльныя дыскі з фільтравальнай паперы, якія былі таксама выкарыстаны для вызначэння адчувальнасці да іх энтэрабактэрый. Пры гэтым дозу прэпаратаў можна лічыць ўмоўнай, але значнай. Вынікі вызначэння адчувальнасці энтэрабактэрый прадстаўлены ў табліцы 2.

Табліца 2 – Адчувальнасць энтэрабактэрый малака да тэрапеўтычных прэпаратаў, мм, (пазначаны № кароў, у – наяўнасць устойлівых форм)

| Прэпараты /№ | 1-337 | 2-394 | 7-521 | 8-780 | 18-242 | 20-672 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Рэцэфур | 26 | 36 | 22 у | 30 | 20 | 16 |
| Цэфарм 2,5% | 34 | 30 | 18 | 30 | 20 | 28 |
| Энрафлокс 5% | 24 | 30 | - | 28 | 28 | 30 |
| Энрафлоксаферон-Б | 26 | 36 | 38 | 30 | 28 | 34 |
| Севаксэль RTU | 26 | 24 | 18 | 26 | 16 | 22 |
| Ветацэф | 28 | 30 | 20 | 22 | 16 | 14 |
| Мастывін | 24 | 22 | 28 | 24 | 24 | 20 |
| Мастывет | 26 | 20 | 15 | 20 | 14 | 12 |
| Мастыцэф | 17 | 24 | - | 18 | 18 | 16 у |
| Мультыбай IMM | 21 | 24 | - | 20 | 18 у | 20 |
| Мастыед голд | 19 у | 22 у | - | 17 | 18 у | 16 у |
| Пенікан П | 21 | 22 | - | 21 | 10 | 18 у |
| Мастаферон | 12 | 13 | - | 12 | 10 | 10 |
| Мастымакс | 23 у | 20 | - | 22 у | 20 у | 20 |
| Ваккамаст | 16 у | 16 у | - | 12 | 12 у | 12 |
| Маміфорт | 15 | 12 | - | 20 | 14 у | 10 |

Аналізуя дадзеныя табліцы 2 можна адзначыць, што ў далейшым трэба пазбягаць выкарыстання прэпаратаў з ніжняй часткі спісу, такіх як маміфорт, ваккамаст, мастымакс, мастаферон, пенікан П, мастыед голд, мастыцэф, да якіх ёсць устойлівыя штаммы энтэрабактэрый. На месцы спецыялісты мелі магчымасць выбраць прэпарат з улікам і адчувальнасці энтэрабактэрый да антыбіётыкаў.